УДК [2-157+7.046.1]:75(476+48)

**Ю. С. Барадзін,**
*аспірант установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск, Беларусь*

# РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ ЯЗЫЧНІЦКАГА ПАНТЭОНА Ў ВІЗУАЛЬНЫМ МАСТАЦТВЕ БЕЛАРУСІ І СКАНДЫНАВІІ

**Анатацыя.** Выяўленчае мастацтва мае цікавасць да візуалізацыі язычніцкага эпасу, казак, саг, легенд і міфаў, і гэты напрамак застаецца актуальным. З дапамогай візуальнага мастацтва сёння рэпрэзентуюцца вобразы язычніцкага пантэона багоў, рэканструюецца ўяўленне пра пабудову Сусвету, якое мелі нашы продкі ў даўнія часы. Міфалагічныя матывы знаходзяць адлюстраванне ў творчасці многіх еўрапейскіх майстроў.

**Ключавыя словы:** язычніцкі пантэон, багі, выяўленчае мастацтва, малюнак, міфалогія, візуалізацыя.

**Y. Borodin,**
*Postgraduate student of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

# REPRESENTATION OF THE PAGAN PANTHEON IN THE VISUAL ART OF BELARUS AND SCANDINAVIA

**Abstract.** Fine art has an interest in visualizing pagan epics, fairy tales, sagas, legends and myths, and this trend remains relevant. Fine art today presents images of the pagan pantheon of gods, reconstructing the idea of the structure of the universe that our ancestors had in ancient times. Mythological motifs are reflected in the work of many European masters.

**Keywords:** pagan pantheon, gods, fine art, drawing, mythology, visualization.

Пасля эпохі ранняга Сярэдневякоўя, калі ў Беларусі і ў краінах Скандынавіі існавала язычніцтва, праз дзясяткі стагоддзяў візуальнае мастацтва працягвае даследаваць канцэпт язычніцкага міфа. Да візуальнага мастацтва адносіцца выяўленчае мастацтва з графікай, жывапісам, фотаздымкам і малюнкам. Выразнасць – якасць, уласцівая мастацтву, таму да малюнка і жывапісу ў выяўленчым мастацтве сёння далучаюць і фотаздымак, бо фотамастакі адлюстроўваюць рэчаіснасць з дакументальнай дакладнасцю. Візуалізацыя страчанага ёсць «бачанне»,

уласцівае ўсім гэтым відам. Міфалагічны жывапіс – частка выяўленчага мастацтва, крыніцай яго выступаюць легенды, паданні, казкі, сагі (казанні). У карцінах міфалагічных сюжэтаў з’яўляюцца вобразы з язычніцкага пантэона багоў розных народаў. Выкарыстоўваючы міф як інструмент, сучасныя мастакі імкнуцца рэканструяваць падзеі язычніцкага мінулага, уяўленні старажытных продкаў.

Праз рэпрэзентацыю беларускага і скандынаўскага пантэона мастакамі робяцца спробы аднавіць і рэканструяваць вобразы багоў у візуальнай культуры. Аўтары мастацкіх твораў адлюстроўваюць у малюнку і жывапісе тое, як яны ўяўляюць сабе язычніцкую эпоху, час, калі продкі беларусаў (крывічы, дрыгавічы, радзімічы) і сучасных скандынаваў (вікінгі) верылі ў пантэон шматбожжа, якіх прытрымліваліся культурных традыцый, якімі былі іх побыт і норавы. Мастаку цікавы вобраз гістарычных асоб, герояў і персанажаў эпохі старажытнасці і ранняга Сярэдневякоўя. На прыкладзе многіх творцаў можна пабачыць, што кожны з іх, маючы ўласнае ўяўленне, па-свойму адлюстроўвае ў візуальным мастацтве, які з беларускіх альбо скандынаўскіх багоў як выглядаў.

Вялікі ўнёсак у рэканструкцыю і аднаўленне пантэона шматбожжа ў сучасным мастацтве ў наш час зрабіў расійскі мастак Ігар Ажыганаў, стварыўшы працы, прысвечаныя беларускім (Бялун, Лада, Род, Пярун, Русалка, Вадзянік, Вялес, Чарнабог, Мара, Сварог, Стрыбог, Жыва) і скандынаўскім (Фрэя, Фрэйр, Локі, Мімір, Одзін, Тор, Бальдр, Ньёрд, Хеймдаль, валькірыі) багам і багіням. На яго карцінах можна ўбачыць аднаго з князёў-заснавальнікаў Кіеўскага княства Вяшчуна Алега і набегі вікінгаў – скандынаўскіх ваяроў. Візуальнае мастацтва ў творчасці І. Ажыганава выкарыстоўваецца і ў якасці параўнальнага аналізу, каб знайсці ўзаемасувязь і падабенства паміж беларускім і германа-скандынаўскім пантэонам. Напрыклад, трох багінь лёсу – Мокаш, Долю і Нядолю ён супастаўляе са скандынаўскімі норнамі – Урд (мінулае), Верандзі (сённяшняе) і Скульд (будучыня), што цікава з пункту гледжання кампаратыўнай міфалогіі ў выяўленчым мастацтве [9].

У XIX ст. стаў вядомы міфалагічнымі ілюстрацыямі нарвежскі мастак Петэр Мікалай Арбо, які рэканструюе падзеі скандынаўскага Рагнарока (апакаліпсісу, канца свету, гібелі багоў),

вобраз багіні любові – Фрэі, дзікага палявання вярхоўнага бога вікінгаў і ўсіх скандынаваў – Одзіна [Там жа].

Швейцарскі мастак Генрых Фюзелі стварыў працу пра бой грамабоя Тора з велізарным і пачварным змеем-цмокам Ёрмунгандам на лодцы падчас марскога падарожжа. На карціне адлюстравана, наколькі Тор і Ёрмунганд, будучы ворагамі, ненавідзяць і жадаюць знішчыць адзін аднаго. Ведаючы наперад прароцтвы і прадказанні Вёльвы, што змей, будучы сынам ётунаў (волатаў) Локі і Ангрбоды, паспрыяе дню скандынаўскага апакаліпсісу і гібелі ў ім багоў, Тор праз адзінаборства з пачварай імкнецца прадухіліць канец свету. Перамагае змея, адправіўшы яго ўдарам молата на дно мора, але змей застаецца жывым, і ім наканавана ў апошні раз сустрэцца падчас фінальнай бітвы паміж багамі і ётунамі [1].

Брытанскі мастак Роланд Пенроўз стварыў вобраз скандынаўскай багіні вечнай маладосці і ахоўніцы маладзільных яблыкаў Ідун. Паколькі скандынаўскія багі – такія ж смяротныя, як людзі, і ім уласціва спачатку старэць, а потым паміраць, багіня Ідун падаўжае ім жыццё і маладосць з дапамогай яблыні, якую дапамагаюць ахоўваць тры багіні лёсу – норны [3].

Дацкі мастак Мікалай Абрахам Абільгор распрацаваў на карціне з’яўленне першага стварэння ў хаосе, цемры і змроку, калі яшчэ не было космасу, і свет не існаваў, – каровы Аўдумлы. З’явіўшыся, карова вылізала з лёду першапродка скандынаўскіх багоў Буры – будучага бацьку аса-Бора, дзеда вярхоўнага бога Одзіна. Менавіта карова Аўдумла паспрыяла з’яўленню першабагоў і наступных пакаленняў у германа-скандынаўскім пантэоне [9].

Нямецкі мастак Фердынанд Леке – адзін з тых, хто ўвасобіў вобраз галоўнага скандынаўскага бога Одзіна. Одзін у выяўленчым мастацтве адлюстраваны як бог вайны, перамог і правадыр вікінгаў, уладальнік дзіды «Гунгнір», гаспадар васьміногага каня Слейпніра. Ён аднавокі, паколькі другое вока ахвяраваў дзеля мудрасці [Там жа].

Расійскі мастак Канстанцін Васільеў паказаў у творах вобраз валькірыі – скандынаўскай ваяўніцы, што спускаецца на сваім кані на месца бітвы, каб забраць з сабой душы тых вікінгаў, што загінулі з мячом у руцэ, у валадарства Одзіна – Вальхалу.

У самой міфалогіі валькірыі застаюцца на поле бітвы нябачнымі для вікінга [Там жа].

Яшчэ адзін расійскі мастак – ілюстратар Дзяніс Гардзееў – намаляваў вобразы скандынаўскіх багоў і герояў для кнігі «Наследники Одина» [4, с. 16].

Брытанскі мастак Чарлз Батлер рэканструяваў карціну эпохі ранняга Сярэдневякоўя – пахаванне вікінга пасля смерці. Як адлюстравана, вікінгаў, так жа як грэкаў, рымлян, беларусаў і іншых індаеўрапейцаў, у эпоху язычніцтва маглі пахаваць з дапамогай трупаспалення. Цела загінуўшага адносілі на карабель. Затым, падпаліўшы наканечнікі стрэл, пускалі стрэлы ў ветразь, і карабель з нябожчыкам адпраўляўся ў апошняе падарожжа [9].

У XIX–XX стст. мастакі ў Беларусі звярнуліся ў сваёй творчасці да язычніцкіх сюжэтаў. Беларускі і польскі жывапісец Казімір Альхімовіч прысвяціў мастацкія творы язычніцкім святарам (жрацам), язычніцкаму капішчу (храму) грамабоя-Перуна [7, с. 89]. Другі мастак – Ян Дамель вяртае праз жывапіс гледача ў 988 г., калі наўгародскім, затым кіеўскім князем Уладзімірам было здзейснена хрышчэнне славян, з прымусам адмовіцца ад уласнага язычніцкага пантэона [Там жа, с. 89]. У XX ст. праз выяўленчае мастацтва ўсе больш абуджаецца цікавасць беларускага народа да сваіх каранёў і гісторыі, да нацыянальнага фальклору краіны. Адзін з найвыбітнейшых мастакоў – Язэп Драздовіч, таксама напісаў твор, прысвечаны змаганню бога вясны і сонца Ярылы з ненажэрным цмокам. Ярылу мастак адлюстроўвае як абаронцу краіны ад усяго злога, Цмока – як ворага Беларусі, што нясе зло і падман. Адзін з беларускіх герояў часоў язычніцтва ў жывапісе Язэпа Драздовіча – спадчыннік дынастыі Рагвалодавічаў (полацкага князя Рагвалода і яго дачкі Рагнеды) полацкі князь Усяслаў Чарадзей, які быў таксама пярэваратнем і мог зрабіцца ваўком [Там жа, с. 115].

Міхась Філіповіч праз візуальнае мастацтва паглыбіўся ў старажытныя язычніцкія абрады продкаў беларусаў «Купалле» і «Гуканне вясны», выкарыстоўваючы ў жывапісе распальванне вогнішча і карагоды, калі ідуць людзі, трымаючы кола вакол агню. Купальскае кола і купальскія гульні працягваюць

рэканструяваць такія беларускія мастакі, як Іван Стасевіч, Міхась Сеўрук, Уладзімір Савіч і Аляксандр Пашкевіч [2].

Сярод мастакоў XX ст. вылучыўся Мікола Селяшчук, які паглыбіўся ў дэманалогію, стварыўшы вобразы чарцей (нячысцікаў) і змея-цмока [5]. Язычніцкіх беларускіх духаў, што адносяцца да больш ніжэйшай ступені, рэканструюе ў выяўленчым мастацтве Валерый Славук [8].

Такім чынам, міфалагічныя сцэны ў выяўленчым мастацтве адлюстроўваюць сюжэты жыцця багоў і персанажаў з язычніцкай міфалогіі. Пантэон багоў у язычніцкіх міфах застаецца актуальным і сёння дзякуючы цікавасці да яго выяўленчага мастацтва. Рэпрэзентацыя язычніцкага пантэона ў візуальным мастацтве не проста вяртанне ў язычніцкае мінулае, але і спроба знайсці новы сэнс для пераасэнсавання самой міфалогіі, каб людзі больш шанавалі яе.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


*1.* Борьба Тора с мировым змеем. – URL: https://app.fta.art/ru/artwork/f0b1f1579b180443d65e2feefa8ab6ecdc6e1d96 (дата обращения: 30.05.2024).

*2.* История белорусского искусства. – URL: https://www.twirpx.com/files/science/art/history/belarusian/ (дата обращения: 30.05.2024).

*3.* Дж. Пенроуз. Живопись, 1890. Богиня Идун. – URL: https://arthive.com/ru/artists/ 9816~Dzh_Penrouz/works/366298~Boginja_Idun (дата обращения: 30.05.2024).

*4.* Наследники Одина. Предания скандинавских народов средневековой Европы / сост.: Е. Балобанова, О. Петерсон. – СПб. : Азбука : Азбука-Аттикус, 2016. – 288 с.

*5.* Селещук, Николай. – URL: https://artdic.ru/authors/show/id/123 (дата обращения: 30.05.2024).

*6.* Родные боги. Картины Игоря Ожиганова. – URL: https://forum.artinvestment.ru/blog.php?b=282605 (дата обращения: 30.05.2024).

*7. Саўко, М. П.* Культура беларускага народа / М. П. Саўко, М. А. Бобер, В. І. Карнацкая. – Мінск : БГМУ, 2023. – 204 с.

*8.* Славук, Валерий Петрович (Валерый Пятровіч Слаук). – URL: https://www.bestiary.us/images/slavuk-vp (дата обращения: 30.05.2024).

*9.* Скандинавская мифология в живописи (49 фото). – URL: https://papik.pro/izobr/jivopis/33418-skandinavskaja-mifologija-v-zhivopisi-49-foto.html (дата обращения: 30.05.2024).